**Латыши и белорусы: вместе сквозь века.** – 2019. – Вып. 8. – С. 95–99.

***АРХИВЫ И ВОСПОМИНАНИЯ***

# ВІЛБЕРТС КРАЙСНАЙС: БЕЛАРУСЫ ЯК АТОЖЫЛАК ЛАТВІЙСКАГА НАРОДУ

## Vilberts Kraisnais: Belarusians as of offspring the Latvians

**Н. Янсанэ (N. Jansone),**
пераклад
*г. Рыга, Латвія*

Публикация представляет собой перевод брошюры, выпущенной Латвийским национальным союзом молодёжи в Риге в 1938 г. Её содержание имеет выраженный идеологический окрас, но одновременно является интересным источником для понимая этно-национальных процессов, протекавших в межвоенной Латвии.

*Ключевые слова*: латыши, белорусы, национальный вопрос.

The publication represents the translation of the brochure published by the Latvian national union of youth in Riga in 1938. Its contents has the expressed ideological color, but at the same time is an interesting source for understanding the ethno-national processes proceeding in interwar Latvia.

*Keywords*: Latvians, Belarusians, ethnic question.

### *Прыгожая і магутная Старадаўняя Латвія*

Многія тысячагоддзі засяляюць латышы сучасную латвійскую зямлю. Яны самастойна апекаваліся Даўгавай з абодвума яе берагамі. Даўгава – латышская рака – на ўсёй 1000-кіламетровай плыні песціла латышскую мову і цудоўную латышскую песню, давала магчымасць нашым продкам наладзіць гандлёвыя сувязі з арабамі, грэкамі і другімі паўднёвымі народамі.

Многія стагоддзі на латвійскай Даўгаве не мела права паказацца ніводная ладдзя чужака. На самых вялікіх стромах гэтай ракі нашы продкі ўзвялі  ўмацаванні, там узніклі гарадзішчы. Яшчэ і сёння ўзгадваюцца на нашай зямлі былыя старажытныя замчышчы на востраве Доле і там, дзе Ліелвардэ, Кокнэсэ, Аўзкраўкле, Ерсіка, Краслава… Гэта былі дбайныя гаспадарчыя і культурныя цэнтры. Толькі на месцы двух даследаваных гарадзішчаў – Даўгмалес і Талсу – знойдзены тысячы каштоўных рэчаў, якія сведчаць і пра багаты дастатак латышоў, і

пра высокі ўзровень развіцця ў старажытнасці, калі наш мацярык яшчэ не ведаў захопнікаў – рускіх, немцаў і іншых чужаземцаў.

Продкі латышоў былі аб'яднаны ў вялікія і малыя гаспадарствы з вызначанай канстытуцыяй для асобнай дзяржавы. Узгадаем услаўленае валадарства Куршу, багатую зямлю геройскіх абаронцаў – Земгале, дзяржаву ваяўнічых барацьбітоў супраць эстонцаў і рускіх – Талаву, а таксама падначаленую ёй Атзэлі, воіны якой нібы хмары імчалі на землі Пскова і Ноўгарада, забіраючы з сабой палонных і здабычу… Латвійскія каралі Віестурс, Намэйсіс, Ламэкінс, Талывалдыс, Вісвалдыс і інш. былі надзейнымі шчытамі сваіх воінаў.

Вялікая і магутная была Старадаўняя Латвія. Далёка на Ўсходзе, дзе сённяшняя Расія – каля Дзвіны-Даўгавы, ля вярхоўяў Дняпра, Акі, Волгі, на тэрыторыі ўсёй цяперашняй Беларусі, у Віцебскай, Смаленскай, Мінскай, у Пскоўскай і Цверскай, а таксама Маскоўскай губернях жылі продкі латышоў. Гэта прызнаюць нават рускія даследчыкі А. Качубінскі, А. Сабалеўскі, А. Спіцын, Ю. Гацье, нямецкія вучоныя М. Фасмер, К. Штэрн, літоўскі прафесар К. Буга, эстонец Ю. Трусман, латвійскія вучоныя праф. Э. Блесэ, Э. Брастыньш, Эд. Паэглэ, М. Сіліньш, К. Розытыс...

***Латвійскія дзяржавы на тэрыторыі сучаснай Беларусі***

"Беларусь – гэта старадаўняя латвійская зямля", − гаворыць наш даследчык Эд. Паэглэ. Тое ж сцвярджае рускі прафесар А. Спіцын. Беларус А. Ляўданскі ў штомесячніку Беларускай Акадэміі навук "Наш край" (1929) пісаў, што да VIII-га стагоддзя тэрыторыю сучаснай Беларусі насялялі не славяне, а латвійскія плямёны. "Пра тагачасную латвійскую Беларусь, − піша А. Ляўданскі, − распавядаюць больш як 1 000 адкрытых на Беларусі латвійскіх гарадзішчаў". А на гарадзішчы Банцараўшчына знойдзены такія ж упрыгожанні і прадметы побыту, якія выяўлены ў нашым Даўгмале і ў раскопках Талсінскага гарадзішча.

Зразумела, што на тых прасторах продкаў, у замчышчах гаспадарамі былі латвійскія князі, як і на карэнных землях. Пра гэта распавядаюць хронікі даўніх часоў. "Калі б мы змаглі ўтрымацца у межах тае прасторы, − сцвярджае В. Букаўс, − то ў Латвіі цяпер налічвалася б каля 30 000 000 жыхароў".

***Пачатак абрусення***

Пасля Вялікага перасялення народаў, пачынаючы з VII-га стагоддзя, як заўважае Ю. Гацье ў сваёй кнізе "Железный век в Восточной Европе" (Масква, 1930) з поўдня па Дняпру, далей па рацэ Ловаць на Ільменскае возера, на Пскоўшчыну праз балцкія землі рухалася вялікая хваля славянаў. Многія стагоддзі нашы продкі вялі войны з чужакамі-

захопнікамі. А. Сабалеўскі, прытрымліваючыся рускай хронікі, мяркуе, што яшчэ ў пачатку XIII-га стагоддзя на Даўгаве і ў вярхоўях Волгі размяшчаліся незалежныя плямёны латвійскіх продкаў. Ёсць звесткі, што яшчэ ў XIII-м стагоддзі на Смаленскай зямлі, а менавіта так мяркуе А. Сабалеўскі, яшчэ знаходзіліся продкі балцкіх павадыроў на сваіх уладаннях. Асабліва варта адзначыць, што падобны стан датычыць Полацкага княства, дзе многія стагоддзі ў яго паўночна-ўсходняй частцы аж да апошняга часу было прысутным балцкае насельніцтва. Нашы продкі ў сучаснай Беларусі засталіся на тых жа самых мясцінах, толькі з гадамі перанацыяналізаваліся.

А. Качубінскі ў часопісе Міністэрства народнай асветы Расіі (1897. − № 1) пісаў, што 12 прытокаў ракі Беразіны маюць балцкія найменні, а па ўсёй Беларусі балцкія назовы сёлаў, рэк, азёраў, узгоркаў, балотаў, далінаў, палян – многія тысячы. Ю. Трусман балцкіх азначэнняў у Полацкім павеце налічыў 500, у Невельскім – 230, Лепельскім – 240, Віцебскім – 280, Гарадзецкім – 240, Веліжскім – 200 і вельмі многа ў Дрысенскім і Себежскім паветах. Сёлаў з латышскім коранем – Латышкі, Латышова, Латышы і ім падобных вельмі многа ў Веліжскім, Віцебскім, Гарадзецкім, Лепельскім, Невельскім, Полацкім і ў іншых паветах Беларусі. Ім падобныя сустракаюцца ў Лудзенскім, Рэзэкненскім краях. Прафесар Я. Эндзэлінь нагадвае, што назвы мясцінаў – такія ж помнікі даўніны, як і археалагічныя раскопы. Прафесар К. Буга, аналізуючы багаты матэрыял пра геаграфічныя назвы, лічыць Беларусь мацерыком латышскага народа. На працягу доўгіх стагоддзяў жыцця на тэрыторыі Беларусі нашы продкі аславяніліся. І ўсё ж ажно да сённяшніх часоў у нас з імі ў духоўнасці, у характары захаваліся подыхі культуры і крэўнай еднасці.

Рускі генерал М. Без-Карніловіч у 1855 г. выдаў у Пецярбургу кнігу “Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии», дзе адзначана і такое: «І хай сабе ад нейкага народа пры яго зліцці са славянамі ўзрадзіліся беларусы, яны ўсё ж захавалі да нашых дзён свае характэрныя рысы, звычаі, думанне, мову, святкаванні, традыцыйныя ўборы”. Пра гэта сведчыць і кніга У. Ламанскага “Верхнее Поднепровье и Белоруссия”, у якой апісанні беларускіх традыцый, святкаванняў, розных урачыстасцяў і г.д. нагадваюць тыя рысы, якія з’яўляюцца роднаснымі і латышам.

Беларус А. Астрэйка ў 1929 г. у Мінску выдаў кнігу “Беларускі ткацкі арнамент”. Там і з тэксту, і з дадатку на каляровых малюнках выяўляецца, што арнамент у ткацтве беларускага народа поўнасцю супадае з латышскімі і літоўскімі размалёўкамі на тканіне.

У мовах беларусаў і латышоў многа слоў з аднолькавым значэннем, што і сведчыць пра іх сапраўдную роднасць. Так С. Сахараў у сваёй кнізе “Рижские православные архипастыри за 100 лет (1836−1936)” адзначае, што латышскае слова arajs па-беларуску – араты, а па-руску – пахарь; і далей: zvans – звон – колокол; vavere – ваверка – белка; pune – пуня – сарай; lava – лава – скамья і інш.

***Страчаныя намі латвійскія пасяленні***

Многія знакамітыя даследчыкі даўніны выказалі свае меркаванні пра старадаўнія этнічныя межы латышоў і прыйшлі да агульнай высновы, што яны знаходзіліся намнога далей на ўсход ад сучаснай дзяржаўнай граніцы.

Дастаткова згадаць латгальскага будзіцеля Нікадэма Ранцана, які на 11-й стар. сваіх “Латвійскіх гісторый” распавядае, што “з усходняга боку абрысы Латгале датыкаюцца нават да Полацка”. Прыблізна пра тое ж піша Крыш’яніс Баранс у сваёй кнізе “Агляд нашай айчыны”. Піянер народнага адраджэння Кронвальдс Атыс адзначае, што “…наша бацькаўшчына гэта не толькі там, дзе сёння латышы жывуць. Уся шырыня прастораў, якую нашы продкі потам і крывёю даглядалі, а ў пазнейшыя часы аказалася раскрэмзанай на дробныя часткі, гэта наша айчына”.

Дырэктар дзяржаўнага статыстычнага ўпраўлення М. Скуеніекс у сваёй кнізе “Латвія. Краіна і жыхары”, выдадзенай у 1927 г., піша: “Мяжа абжытых латышамі земляў была зусім іншая, чым зараз. Так Дрысенскі павет у сучаснай Расіі даўней у большай ступені быў латвійскім, але на працягу апошніх стагоддзяў тыя латышы апалячыліся і ў большай частцы абруселі…”

К. Розытыс у сваёй кнізе “Рыжскія архіепіскапы, уладары старажытнага Відзэмэ” піша: “Мяжу даўняй Латгале пасля падпісання мірнай дамовы між Латвіяй і Расіяй 11 жніўня 1920 г. перанеслі, цяпер былыя латгальскія Росіца, Савейкі, Асвея і другія каталіцкія адміністратыўныя раёны знаходзяцца пад Расіяй”. К. Розытыс цвердзіць, што ў Дрысенскім павеце даўней існавалі па-сапраўднаму каталіцкія прыходы: Прыдруйск, Індра (Бальбінова), з аддзяленнямі ў Пустыні, Росіцы, Асвеі, Савейках. За гэтымі прыходамі месцяцца прыходы праваслаўных беларусаў, даўніх латышоў, абрусенне якіх пачалося ўжо ў часы Полацкага княства разам з увядзеннем праваслаўя…”

Падобныя назіранні за праяўленнямі латышскасці ёсць і ў знакамітага нашага этнографа М. Сіліня. У сваім “Рэха каляндары” за 1890 г. ён пісаў: “І ў Дрысенскім павеце яшчэ жыхарствуюць латышы. Налічваем такіх 10 тысяч. Магчыма і гэтую колькасць павялічыць, калі прыняць пад увагу,

што мы маем сарамлівых латышоў, якія пры перапісу выстаўляюць сябе людзьмі іншай нацыянальнасці”.

У часопісе “Zemkopja” (1912) у нарысе пра латгальцаў напісана: “Латышы пражываюць у Дрысенскім павеце ў 4-х прыходах Дрысенска-Себежскага дэканату. Тут большая частка іх акаталічылася і прыбеларусілася. У Савейках – каля 4 200 латышоў. У Росіцы – 7 300, у Асвеі – 4 100 і ў Дрысе – 1 900. Усяго ж у Дрысенскім прыходзе 17 500 латышоў”. У “Вялікай энцыклапедыі” Мэйера (1902) у 8-м томе чытаем, што ў 1897 г. у Дрысенскім павеце і ў горадзе пражыва 98 тысяч 72 жыхары – беларусы, латышы, габрэі, палякі, рускія.

Тут варта было б адзначыць, што Ю. Трусман вывучаў мову і тапаніміку былой Віцебскай губерні. У кнізе “Этымалогія мясцовых назваў Віцебскай губерні” (Рэвель, 1897) ён адзначае больш як 200 адпаведных латышскаму назову вёсак і маёнткаў у ваколіцах Дрысы: Аўгулі, Баліны, Бузава, Ганусава, Гарбулі, Гірыны, Даргелі, Казулі, Куры, Лапуны, Лубасна, Плейкі, Пупікі, Савейкі, Сардыкі, Стаклы, Суніца і мн.інш. Паводле Трусмана, і ў Себежскім павеце каля 250 пасяленняў адпаведных латышскаму назову: Буданы, Вепры, Грузды, Гутава, Круцелі, Лемяшы, Пунькі, Рудакі, Сцяпаны, Танцулі, Шаўры…

***Працяг у наступным нумары***